Тарасава, Т.М. Глобус Адам / Т.М. Тарасава // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы, Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. ; пад рэд. А.В. Мальдзіса ; рэдкал.: І.Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск, 1993. – Т. 2. – С. 224–225.

# ГЛОБУС АДАМ



Глобус Адам (сапр. Адамчык Уладзімір Вячаслававіч; н. 29.9.1958, Дзяржынск (Мінскай вобл.), паэт, празаік, мастак. Член СП Беларусі з 1988.

Нарадзіўся ў сям'і пісьменніка Вячаслава Адамчыка. У 1959 разам з бацькамі пераехаў у Мінск. Пасля сканчэння васьмі класаў з 1973 па 1977 займаўся на педагагічным аддзяленні Мінскага мастацкага вучылішча. Атрымаўшы дыплом настаўніка рысавання, працягваў вучобу ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце на мастацкім факультэце. У 1982—83 А. Глобус працаваў у спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных майстэрнях — чарцёжнікам, мастаком-рэстаўратарам, мастаком-афарміцелем. Вольны час аддаваў літаратуры. З 1987 — рэдактар аддзела сацыяльных праблем часопіса «Крыніца».

Першыя вершы А. Глобус апублікаваў у 1981 у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Маладосць». А першы зборнік вершаў «Парк» выйшаў у 1988 у выдавецтве «Мастацкая літаратура». У лірыцы А. Глобуса выявілася самастойнае і своеасаблівае бачанне свету і чалавека. Крытыкі схільны лічыць яго «гарадскім» паэтам, але не цураецца ён і вясковай тэмы. У творах пісьменніка відаць плённы ўплыў мастакоўскай адукацыі, лірычныя мініяцюры паэта падобны на «графічнасць твораў» (В. Вітка), адчуваецца павага да роднага слова, уніклівы позірк на жыццё, крытычнае асэнсаванне вопыту эстонскай, заходне-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

еўрапейскай і паўночнаамерыканскай, а ў паэзіі яшчэ і старажытнаяпонскай, кітайскай літаратур. А. Глобус спрабуе культываваць у беларускай лірыцы трохрадкоўі і іншыя формы японскай паэзіі. Выклікалі цікавасць драматычныя эцюды, напісаныя ім разам з У. Сцяпанам і пастаўленыя ў аматарскіх тэатрах «Рог» і «Прывід». Перакладае з эстонскай паэзіі на беларускую мову.

*Т. М. Тарасава.*